УДК 81'42:[81'373:811.161.3] М. Шабовіч

# АСТРАЛЬНАСЦЬ – ЯСНАПАД: МАТЭРЫЯЛЫ ДА СЛОЎНІКА АКАЗІЯНАЛЬНАЙ ЛЕКСІКІ МІКОЛЫ ШАБОВІЧА

А. У. Цімашэнка
*УА «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка»;*
*Мінск (Рэспубліка Беларусь)*
*Навук. кір. – Т. А. Астапчык, к.ф.н., дацэнт*

# АСТРАЛЬНАСЦЬ – ЯСНАПАД: MATERIALS FOR THE DICTIONARY OF MIKOLA SHABOVICH'S OCCASIONAL WORDS

A. Tsimashenka
*Belarusian State Pedagogical University named after Maxim Tank;*
*Minsk (Republic of Belarus)*
*Scientific adviser – T. Astapchyk, PhD Associate Professor*

Аўтарскія неалагізмы, або аказіяналізмы, з'яўляюцца незвычайнай моўнай з'явай і ілюструюць дэрывацыйныя і семантычна-стылістычныя магчымасці мовы. У артыкуле прадстаўлена практычная частка даследавання аказіянальных назоўнікаў вядомага беларускага паэта, лінгвіста Міколы Шабовіча, зроблена спроба рэпрэзентаваць семантыку аказіяналізмаў, іх словаўтваральную матывацыю і праілюстраваць асаблівасці функцыянавання ў кантэксце.

Author neologisms, or occasionalisms, are an unusual linguistic phenomenon and illustrate the derivational and semantic-stylistic possibilities of language. The article presents the practical part of the study of occasional nouns created by the famous Belarusian poet, linguist Mikola Shabovich, the attempt to represent the semantics of the occasionalisms, their word-forming motivation and to illustrate the peculiarities of their functioning in the context is made.

Ключавыя словы: аказіяналізм; паэзія; Мікола Шабовіч; назоўнік; аўтарская словатворчасць; паэтычнае маўленне.

Keywords: occasionalism; poetry; Mikola Shabovich; noun; author's word-creation; poetic speech.

Аўтарская словатворчасць, бясспрэчна, з'яўляецца адной з крыніц узбагачэння лексічнага складу мовы [2, с. 130]. Перад даследчыкамі аказіянальнай лексікі стаіць шэраг нявырашаных пытанняў, сярод якіх праблема размежавання аказіянальных і патэнцыяльных слоў, прыметы аказіяналізмаў, дэрывацыйныя асаблівасці, спецыфіка семантычнага дэкадзіравання індывідуальна-аўтарскіх слоў і інш. Акрамя таго, адсутнічаюць слоўнікі аказіяналізмаў, якія маглі б запоўніць лакуны тэорыі аўтарскай словатворчасці.

У артыкуле прадстаўлены фрагмент слоўніка аказіянальнай лексікі, сабранай з твораў вядомага беларускага паэта, перакладчыка, лінгвіста Міколы Шабовіча. Матэрыялам для даследавання паслужылі паэтычныя кнігі “Падары мне сваю адзіноту”, “Мая надзея”, “Я і Ты”, “Маладыя мроі маладога лета”, “Пад маміным крылом...”.

**АСТРАЛЬНАСЦЬ.** Стан, які характарызуецца забыццём: *І ўсе-ткі, не пакінуўшы надзей, вяртаешся ў забытую* ***астральнасць****…* (М. Шабовіч).

**БЕРАГІНЯ.** Жанчына, якая зберагае прыродныя багацці: *Чым ты, бялявая Лясоўна, Зямлі і Неба* ***берагіня****…* (М. Шабовіч).

**БЯЗМЕЖ.** Бясконцасць, бяскрайнасць: *Тут мой верш імкнуўся ў* ***бязмеж****…* (М.Шабовіч).

**ВЕРШАСПЛАЎ.** Паэтычнае натхненне: *Дзень добры, мой шчымлівы* ***вершасплаў****…* (М.Шабовіч).

**ВЕРШНІЦА.** Дзяўчына, якая здзейсняе і вершыць дзеянні: *Цябе, сваволю,* ***вершніцу*** *фантазій…* (М.Шабовіч).

**ВУСНАВЕЙ.** Веянне (прыцягненне) вуснаў: *Ты з ім. Ты гэтага хацела, уся ў палоне* ***вуснавею****…* (М.Шабовіч).

**ГАНЕБА.** Ганьба, трывожны час без натхнення: *Нялёгка пішуцца радкі ў час* ***ганебы****…* (М.Шабовіч).

**ДАЖДЖАПАД.** З’ява прыроды, моцны дождж: ***Дажджапад.*** *Халадэча. І падману асцё…* (М.Шабовіч).

**ЗАВЕЙНАСЦЬ.** Хуткаплыннасць, мітусня (ад завейны): *У* ***завейнасці*** *сцюжных аблок прыгадай гэты вечар шчымлівы…* (М. Шабовіч).

**ЗАХМАР’Е.** Месца ў прасторы, што знаходзіцца за хмарамі; нябёсы: *Валасоў тваіх дзіўных лён мякка-руса ў* ***захмар’е*** *клікаў…* (М. Шабовіч); *Нас разлучылі – і ў сівым* ***захмар’і****…* (М. Шабовіч).

**ЗЕЛЕНАВІР.** Вочы ярка-зялёнага колеру: ***Зеленавір*** *лагодлівых вачэй, як аніўто, мае прыгожыць дні…* (М.Шабовіч).

**КРУГАБЕЖНАСЦЬ.** Цыклічнасць, кругазварот: *І ў гэтым коле, гэтай* ***кругабежнасці****…* (М.Шабовіч).

**ЛЕТУЦЕНЬ.** Летуценнік; наіўны чалавек, які жыве марамі: *Мне хтосьці скажа: “****Летуцень****! Яна табе зусім не роўня…”* (М.Шабовіч).

**ЛІСТАБОЙ.** Тое, што і лістапад: *Нам не вярнуцца ў колішнюю восень – у пачуццёвы светлы* ***лістабой****…* (М.Шабовіч).

**ЛЯСІНЯ.** Жыхарка лесу, у якой ёсць улада: *Лясіца, Лясуха,* ***Лясіня*** *– нібыта Царыца, Княгіня…* (М. Шабовіч).

**ЛЯСОЎКА.** Жыхарка лесу: ***Лясоўка****, Лясуня, Лясоўна – нібыта Царэўна, Князёўна…* (М. Шабовіч).

**ЛЯСОЎНА.** Міфічная істота, якая жыве ў лесе: *Чым ты, бялявая* ***Лясоўна,*** *Зямлі і Неба берагіня…* (М. Шабовіч); *Лясоўка, Лясуня,* ***Лясоўна*** *– нібыта Царэўна, Князёўна…* (М. Шабовіч).

**ЛЯСУНЯ.** Жыхарка лесу, у якой ёсць улада: *Лясоўка,* ***Лясуня,*** *Лясоўна – нібыта Царэўна, Князёўна…* (М. Шабовіч).

**ЛЯСУХА.** Жыхарка лесу, у якой ёсць улада: *Лясіца,* ***Лясуха,*** *Лясіня – нібыта Царыца, Княгіня… (М. Шабовіч).*

**МАТЫЛЬКОВАСЦЬ.** Асалода, лёгкі дотык: *Каб дзіўных вуснаў* ***матыльковасць*** *адчуць…* (М.Шабовіч).

**НАІЎ.** Наіўнасць; абстрактны назоўнік ад наіўны: *З мараю заручоны – бачыць вачэй* ***наіў,*** *мветлых, незамусмучоных…* (М.Шабовіч).

**НЕСУТРЫМ.** Тое, што немагчыма стрымаць: *О пачуццяў сляпы* ***несутрым!..*** (М.Шабовіч).

**НЯЗДРАДА.** Антонім да слова здрада: *На паўдарозе да нявернасці, паміж* ***няздрадаю*** *і здрадай…* (М.Шабовіч).

**НЯСТРЭЧА.** Антонім да слова сустрэча: *Забудзь пра ўсе* ***нястрэчы*** *і падманы…* (М.Шабовіч).

**ПЛЯЖНІЦА.** Жанчына, якая наведвае пляж: *На спусцелым няўтульным пляжы загарае адзіная* ***пляжніца…*** (М.Шабовіч).

**ПРЫПЫН.** Тое, што і прыпынак: *Гэта проста* ***прыпын*** *– невялікі…* (М.Шабовіч).

**ПРЫЦЕМ.** Лёгкая цемра: *Лёгкі* ***прыцем,*** *і ты, і зіма, і спакусных вачэй каралеўства…* (М.Шабовіч); *Нас з табою не злучыць ён ні зімою, ні ў* ***прыцем*** *весні…* (М.Шабовіч).

**РАЗВІТ.** Тое, што і развітанне: *Шчэ май, здаецца белаквеціць, ужо* ***развіт*** *абсяг ліловіць…* (М.Шабовіч); *І столькі ж пацалункаў на* ***развіт…*** (М.Шабовіч).

**РАТОЎЦА.** Той, хто ратуе; збаўца: *Час, што ніяк не спыніць, – наш суддзя і* ***ратоўца,*** *– ведае ўсё: ён ад Бога найпершы вястун…* (М.Шабовіч).

**РЫЖАНЬ.** Высокая канцэнтрацыя рыжага колеру: *Рыжыкаў* ***рыжань*** *Алёнку зрыжэла заве ў рыжую замець…* (М.Шабовіч).

**САНЦАПАС.** Святло сонца, промні сонца: *Але, пакуль шчыруе* ***санцапас…*** (М.Шабовіч).

**СВЕТЛАГРАД.** Светлы горад, новы горад, жыццё ў якім нараджае надзеі: *Каб наноў трапятаць ад спакуслівых мрой у падораным лёсам надзей* ***Светлаградзе…*** (М.Шабовіч); *За* ***Светлаград,*** *працяжнікі і коскі…* (М.Шабовіч).

**СВЕТЛАПАД.** Яскравы погляд: *Вачэй тваіх маўклівы* ***светлапад*** *атуліць ласкай, дабрынёй сагрэе…* (М.Шабовіч).

**СВЕТЛАСПЕЎ.** Светлая песня: Дзён маіх ***светласпеў*** – незямная жанчына… (М.Шабовіч).

**СІНЕЧ.** Канцэнтрацыя сіняга колеру; нябёсы: *Тыя словы абудзяць* ***сінеч***… (М.Шабовіч).

**СПАТОЛЕНАСЦЬ.** Рэальнасць, ява, здзяйсненне: *Дзень Валянціна – казачнае свята – падорыць нам* ***спатоленасць*** *надзей*… (М.Шабовіч).

**СУМОЦІНКА.** Лёгкі сум, смутак: *Чаму ж* ***сумоцінка*** *ў вачах, нібыта мары – толькі мары...* (М.Шабовіч).

**СЭРЦАБОЙ.** Пульсаванне сэрца, жыцця, кахання: *Трапечуцца кахання стрэлы і мар пульсуе* ***сэрцабой***… (М.Шабовіч).

**СЭРЦАТРАСЕННЕ.** Напружанае перажыванне, хвалюючая падзея: *На вуліцы Эннай адбылося* ***сэрцатрасенне***… (М.Шабовіч).

**ХЛУСНЯСПЕЎ.** Ліслівая няпраўда: *І не складаць нікому* ***хлусняспеў***… (М.Шабовіч).

**ЦІХАСПЕЎ.** Унутраны голас, мысленне, супакаенне: *І піць пачуццяў* ***ціхаспеў***… (М.Шабовіч); *Дзён* ***ціхаспеў*** *адляціць – не стрымаць*… (М.Шабовіч).

**ЦІШЫНЬ.** Тое, што і цішыня: *Маўклівасць нашую,* ***цішынь***… (М.Шабовіч).

**ЦЯМНЕЧА.** Цемра: *На жаль, нічога не зыначылі два пацалункі ў* ***цямнечы***… (М.Шабовіч).

**ЯСНАПАД.** Зарапад, светлае падзенне: *Як сыпаўся зор* ***яснапад…*** (М.Шабовіч).

Аказіянальныя словы, створаныя М.Шабовічам, – каштоўны скарб беларускага паэтычнага маўлення. Прадставіць семантыку і словаўтваральную матывацыю аказіяналізма, як бачым, вельмі складана, што абумоўлена няпэўнасцю семантыкі аўтарскага дэрывата, суб’ектыўнасцю ўспрымання і дэкадавання такіх адзінак [1, с. 60], аднак гэта важная праца мае вялікае значэнне для ілюстрацыі працэсаў аўтарскай неалагізацыі ў сучаснай беларускай мове, захавання аказіянальных слоў як сведчанне словаўтваральна-стылістычных магчымасцей мовы.

**Бібліяграфічны спіс**

1. Басава, Г. “Наталяю смагу словам сакавітым…” / Г. Басава // Род. слова. – 1995. – № 12. – С. 59–61.

2. Шабовіч, М. В. Аказіянальныя словы ў беларускіх мастацкіх тэкстах 20-х гадоў ХХ стагоддзя / М. В. Шабовіч ; навук. рэд. П. А. Міхайлаў. – Мінск : Логвінаў, 2013. – 198 с.